Божы сын

Аўтар: Галіна Зданевіч, г. Ваўкавыск
14.07.2019 00:00



У адной удавы быў маленькі сын, якога яна вельмі любіла. Хлопчыка звалі Андрэй. Жанчына шмат працы ўкладала ў яго выхаванне, таму што ў жыцці чалавека гэта самае важнае і неабходнае.

З ранняга дзяцінства хлопец ведаў, што трэба дапамагаць не толькі маме, але і іншым людзям: хворай бабульцы, адзінокаму пажылому мужчыну, малодшым дзецям, суседзям, таварышам. Каму вады з калодзежа прынясе, каму ў магазін ці ў аптэку збегае, цацкі парамантуе… Усе любілі Андрэя як шчырага і добрага чалавека. Але часам, каб ніхто не бачыў, хлопчык плакаў, таму што яго тата памёр маладым. Калі жанчына заўважала яго слёзы, суцяшала сына як магла.

А аднойчы яна сказала:

– Сынок, у цябе няма таты, але ёсць я. А ў некаторых дзяцей няма ніводнага з бацькоў, і яны жывуць у дзіцячых прытулках. Таму не грашы перад Богам і перастань плакаць. Акрамя роднага таты ў кожнага чалавека ёсць яшчэ Айцец Нябесны. Ён усё бачыць, усё чуе, усё ведае. Гэта наш Бог. Ён даў нам зямлю, насяліў яе птушкамі і жывёламі, а пасля стварыў чалавека і растлумачыў, як той павінен жыць: берагчы прыроду, любіць людзей і жывёл, нікога не крыўдзіць. І не праліваць лішніх слёз, а дапамагаць таму, каму цяжэй. † Хлопчык уважліва слухаў маму, а пасля запярэчыў:

– Але ж у Бога толькі адзін Сын – Езус Хрыстус, які прыняў крыжовую смерць і выратаваў нас ад вечнай смерці!

– Правільна, – згадзілася мама. – Езус – Сын Бога, але і кожны з нас – таксама Яго дзіця.

Аўтар: Галіна Зданевіч, г. Ваўкавыск
14.07.2019 00:00

– Значыцца, і я Божы сын? – здзіўлена спытаўся Андрэй.

– Канешне, – адказала мама. – Таму памятай, што трэба жыць прыстойна, заўсёды быць добрым і справядлівым, каб не гнявіць і не крыўдзіць нашага Айца.

Паслухаў Андрэй маму, павесялеў і ўжо больш не плакаў. А што б ні рабіў, паўтараў сам сабе: “Я Божы сын”.

***

Час ішоў, хлопец падрастаў. Ужо калі быў падлеткам, стаў сам зарабляць грошы. Пасля школы працаваў у аўтамайстэрні, многаму там навучыўся. Разам з мамай вырошчваў ягады і розную гародніну. Быў добразычлівым. Ратаваў ад галоднай смерці бяздомных катоў і сабак: прыносіў іх дадому, падлечваў, знаходзіў добрых гаспадароў.

Аднойчы некалькі аднакласнікаў насмешліва спыталіся ў яго:

– Навошта гэтым займаешся? Якая табе карысць?

– Карысці я не шукаю, а іх, пакінутых людзьмі, шкадую, – адказаў Андрэй. – І святы Францішак карміў птушак ды жывёл, нават ваўка старога выратаваў ад смерці.

– Але ж ты не святы Францішак, – запярэчылі аднакласнікі.

– Не, – пагадзіўся хлопец, – але я іду па яго слядах, бо ўсе мы з’яўляемся дзецьмі аднаго Бога.

Насмешнікі замаўчалі і задумаліся над тым, што ён сказаў.

***

Пэўнага разу адзін мужчына папрасіў Андрэя дапамагчы прадаць кусты маліны, якія выкапаў у лесе. Хлопец згадзіўся.

Сталі да іх на рынку падыходзіць людзі ды пытацца, ці добры гатунак маліны.

– Так, добры. Ягады вялікія, – адказваў мужчына.

А Андрэй вазьмі ды скажы:

– Гатунак лясны. Лясная маліна гэта!

Людзі пачалі адварочвацца ды адыходзіць.

– Што ж ты нарабіў? – закрычаў на хлопца мужчына. – Ты ж мне ўсю справу сапсаваў!

– Я хлусіць не буду. Справа так пойдзе, як Бог дасць, – рашуча адказаў Андрэй і гучна закрычаў: – Каму патрэбна маліна лясная, лекавая ягада?

Людзі навокал сталі прыслухвацца, цікавіцца – і хутка ў мужчыны не засталося ніводнага куста.

– Твая праўда, – урэшце згадзіўся ён. – Відаць, сам Бог нам дапамог.

– Бог заўсёды дапамагае тым, хто Яго любіць і шануе. А вось хлусіць ні перад Богам, ні перад людзьмі не трэба, – запэўніў Андрэй.

***

Падчас службы ў арміі хлопец трапіў у марскі флот. Аднойчы была моцная бура. Невялікі карабель, на якім знаходзіўся Андрэй разам з саслужыўцамі, пачаў тануць. Яго шпурляла на хвалях, як шчэпку. Усе вельмі перапалохаліся і разгубіліся. Радыст перадаваў сігнал “SOS” і прасіў дапамогі.

– Давайце памолімся Богу і Маці Божай, каб уратавалі наша жыццё, – сказаў тады Андрэй.

І ўсе – нават тыя, хто раней не верыў у Бога або насміхаўся з хлопца, – сталі паўтараць за ім малітвы. Не паспелі яны скончыць, як побач паказаўся вялікі карабель.

Аўтар: Галіна Зданевіч, г. Ваўкавыск
14.07.2019 00:00

Экіпаж быў выратаваны, а судна на буксіры дастаўлена ў порт.

Праз некаторы час Андрэй вырашыў пайсці ў духоўную семінарыю, каб несці Божае слова людзям, каб на свеце было менш зла, квітнелі дабрыня, мір і любоў. Урэшце ён знайшоў сябе – Божы сын!